

Информационный бюллетень

Глуского районного клуба избирателей



Выпуск 9 (11)
Июнь 2000 г.

Хлебные страдания

Недолго радовались глущане бобруйскому хлебу, который ежедневно на протяжении последнего времени привозила автолавка из Бобруйска в Глуск. За вкусным и дешевым серым хлебом и пшеничными батонами постоянно выстраивались очереди. Те, кто не успел купить бобруйский хлеб, шли в магазин за отечественным. Некоторое время назад бобруйский хлеб тоже, как и сейчас, регулярно привозили в Глуск. А потом перестали. И хотя на этот раз Людмила Клыга, заместитель председателя райисполкома по торговле, заверяла во время прямой линии, что она за то, чтобы бобруйский хлеб привозили и дальше, все произошло, как в первый раз.

Вначале машине с бобруйским хлебом запретили становиться около базара, на самом бойком и удобном месте. Она вынуждена была ютиться на задворках, около гостиницы. Затем приезжала к военкомату. Люди с утра занимали здесь очередь. Со стороны это выглядело немного странно – очередь на пустом месте… Но приезжала машина – и все становилось на свое место. За час-другой глущане раскупали весь хлеб, и автолавка уезжала, чтобы на другой день порадовать жителей Глуска новой порцией высококачественных хлебобулочных изделий. Но вот на этой неделе напрасно ждали бобруйскую машину. И опять все пошло, как раньше: бобруйчанам – бобруйское, глущанам – глуское. Правда, утром по привычке многие еще заглядывают под раскидистые деревья у военкомата в надежде увидеть знакомую машину. Но увы… Не преодолеть невидимых преград бобруйскому хлебу. Когда еще снова попадет он на стол глущанам? Может, надо объединиться Глуску с Бобруйском, чтобы о хлебе не тужить? Да и кефир тогда, наверное, в глуских магазинах появится. И сливки, и шоколадное масло… Кто за интеграцию Бобруйска и Глуска? Я – за.

Выстрелы около автостанции

На прошлой неделе глущан, живущих недалеко от автостанции, рано утром разбудил громкий треск, похожий на тот, который издает раскаленная черепица. Кое-кто подумал, что это пожар. Но оказалось, что трещит не шифер. Это звучали выстрелы. При попытке ограбления автостанции был застигнут злоумышленник, который бросился на милиционеров с топором. Пришлось стрелять. Грабитель был ранен и задержан. После излечения его ждет суд.

Переправа, переправа, берег левый, берег правый...

На областных соревнованиях по технике пешеходного туризма среди педагогических работников Могилевской области, которые прошли недавно в деревне Ямница Могилевского района и которые проводятся уже в восьмой раз, впервые выступила команда Глуского района.

В программе соревнований в первый день была короткая дистанция, где нужно было проявить умение вязать узлы, переправляться через речку по бревну, по навесной переправе, преодолевать параллельные перила, проходить брод, разжигать костер и т.д. Глущане стали восьмыми на этих соревнованиях, в которых приняли участие 14 команд.

Ночью прошли соревнования по ночному ориентированию, в ходе которых в темноте с фонарями необходимо было по карте найти пострадавшего и доставить его на носилках на финиш. В этих состязаниях глущане выступили довольно неплохо для новичков, заняв второе место и уступив только бобруйчанам.

На следующий день участникам соревнований пришлось проявить свои способности на длинной дистанции, где многие препятствия повторяли этапы первого дня с тем отличием, что нужно было самим уложить бревно, установить навесную переправу и т.д.

Пройдя через все препятствия, расположенные на трассе протяженностью примерно 6 км – навесная переправа, спуск с горы, укладка бревна, переноска пострадавшего, брод через речку, подъем в гору, да еще и приняв участие в поисках контрольных пикетов на этапе ориентирования, команда Глуского района заняла в итоге 7-е место.

По условиям соревнований, команда должна была состоять из 5 мужчин и 1 женщины.

За Глуский район в этих необычных соревнованиях мужественно выступали Мван Болденко из Клетненской СШ, Михаил Голуб из Старосельской НСШ, Сергей Кипель из Катковской СШ, Алеся Корбут из Глуского детсада № 2, Анатолий Мартинович из Балашевичской НСШ, Владимир Тупица из Глуского районного детско-юношеского клуба физической подготовки, Галина Юхневич из Заелицкой СШ.

Как отмечает Владимир Тупица, опытный турист, участвовавший в сотнях походах и десятках соревнований, под руководством которого команда глущан готовилась к соревнованиям, участие в них было бы невозможно без помощи бобруйского турклуба "Меридиан", снабдившего туристов из соседнего района необходимым снаряжением – веревками,

карабинами, страховочными системами.

Опыт, полученный на соревнованиях, глуские педагоги смогут передать своим школьникам в совместных походах. Туристское лето продолжается.

Воруют...

В последнее время Глуск буквально захлестнула волна краж. Попытка ограбления автостанции, кража продуктов в магазине “Кулинария” и соседнем с ним ларьке, набег на магазин районного узла связи, кража телефакса из общепита...

А про велосипеды и говорить не приходится. Пропадают у магазинов, квартир и даже церкви.

Исчезают куры на подворьях. Глущане уже смирились с этим явлением и большей частью даже не обращаются в милицию из-за пропажи одной-двух несушек. Разве что когда уже тащат по крупному, штук по шесть, как это случилось недавно.

Как видно, воры никого не боятся. Ни бога, ни черта, ни людей, ни милиции.

А на каяке – слабо проплыть?

Команда глуских туристов приняла участие в соревнованиях по технике водного туризма, которые провел Бобруйский зональный туристско-спортивный клуб “Меридиан”. Соревнования прошли в Глуском районе на реке Птичь около деревни Городок. На дистанции водного слалома было установлено 11 ворот, которые преодолевали участники соревнований на байдарках, катамаранах и каяках, плывя как по течению, так и против. Причем в некоторые ворота нужно было пройти задним ходом.

Глущане впервые приняли участие в подобных соревнованиях. И хотя в глуской команде были туристы, которые раньше ходили в водные походы на байдарках, и потому имели опыт управления этими двухместными складными лодками с каркасом из алюминиевых трубок, обтянутым непромокаемой тканью, остальные плавсредства они увидели впервые. Но, преодолев смущения и страхи, взяли в руки весла и принялись осваивать катамаран и каяк. Если надежный и солидный катамаран, сделанный из двух надувных поплавков, скрепленных поперечными алюминиевыми трубками, не вызвал особых проблем в управлении – важно было только обоим гребцам научиться синхронизировать свои движения, чтобы заставить двигаться это



судно в нужном направлении, то с каяком все оказалось сложнее. Маленькое верткое одноместное судно, в которое приходится буквально втискиваться, чтобы сесть, оказалось настолько чувствительно к каждому удару веслом по воде, что на первых порах, казалось, заставить его двигаться по прямой невероятно трудно. А вот сделать оверкиль, или кильнуться, как говорят





водники, так, что каяк окажется наверху, а его пассажир – внизу, так это проще простого. Тем не менее к вечеру первого дня после упорных тренировок Саше, воспитаннику туристского кружка, которым руководит заядлый турист Владимир Тупица, уже удалось пройти на каяке некоторые ворота, не задев их ни с одной стороны. Да и сам Владимир Афанасьевич тоже более или менее освоил управление утлым суденышком. И на следующий день оба успешно прошли дистанцию водного слалома на каяке. Конечно, до бобруйчан еще расти и расти, но, как оказалось, и каяком можно научиться управлять, если сильно захотеть. А катамаран под Владимиром Тупицей и его бывшим воспитанником Игорем Куксиком просто птицей летел по дистанции.

Накануне Ира Глинская, сев в байдарку с Владимиром Тупицей, также удивила своими способностями к обучению гребному делу. Если после первого заплыва их смешанного экипажа бобруйчане посоветовали Ире оставить весло на берегу, чтобы не держать его зря в руках без дела рядом с работающим за двоих Владимиром Афанасьевичем, то в последующих попытках Ирина уже тоже усердно махала веслом, и с каждым разом это у нее получалось все лучше и лучше.

Два дня на берегу Птичи пролетели незаметно. И, хотя глуская команда не осмелилась принять участие в соревнованиях по спасательным работам, во время которых нужно было переворачиваться как на каяке, так и на катамаране, все-таки ей удалось занять четвертое место, обойдя при этом кое-кого из бобруйчан. Энтузиазм Владимира Тупицы, собравшего команду для участия в этих соревнованиях, не пропал даром. "А в следующем году мы будем участвовать в таких соревнованиях?", –вопрос, заданный ему неоднократно по окончании состязаний товарищами по команде, засвидетельствовал, что у ребят появился интерес к водному туризму. Осталось найти денег, чтобы купить хотя бы одну байдарку, потому что в Глуске нет пока ни байдарок, ни тем более, каяков и катамаранов. Владимир Афанасьевич надеется, что удастся найти 250 долларов, и осуществить давнишнюю мечту глуских туристов – отправиться в водный поход по Птичи на собственных байдарках.

И. Кирин

Фото автора

Хлеб снова подорожал

В магазинах Глуска снова подорожал хлеб. Если на прошлой неделе цена батона была 157 рублей, то на этой он уже стоил на треть больше – 190 рублей. Черный хлеб теперь стоит 187 рублей.

Райисполком закрыт – все на сельхозработах

Такую табличку можно было вешать на дверях райисполкома во второй половине этой недели. В эти дни в райисполкоме практически никого не было – все работники отправились на заготовку сена. Ударным трудом ответили на этот пример работники культуры – они также оставили библиотеки и Дома культуры и отправились на колхозные поля.

Совещание предпринимателей

Состоялось совещание предпринимателей района. Представители санитарной службы, налоговой инспекции, фонда социальной защиты ознакомили предпринимателей с новыми требованиями, главными среди которых были такие, как наличие сертификатов качества на всю продаваемую продукцию, перерегистрация всех договоров, заключенных с продавцами, работающими у предпринимателей с начала года с последующей уплатой взносов в фонд соцстраха за каждого работника, необходимость использования специальных холодильников для хранения скоропортящихся товаров на рынке и т.д.

Прокати нас, Петруша, на тракторе, до околицы нас прокати...

Невыход на линию автобусов пригородных маршрутов стал в Глуском районе довольно частым явлением. В начале апреля не ходили автобусы по основным районным маршрутам. В начале июня также не вышли в рейс все автобусы, кроме междугородных. По словам директора глуского автопредприятия № 15 Виктора Лазаренко, машинный парк пришлось значительно сократить из-за нерегулярного финансирования. Если раньше он насчитывал 120 единиц, то сейчас в автопарке всего 35 автобусов и 40 грузовых машин.

Автобусный парк должен ежегодно обновляться на 15-20%. В то же время два года назад было приобретено 2 новых автобуса ПАЗ и один автобус ЛАЗ-697 подарило министерство. Техника старая, изношенная,

требует замены. Приходится продлевать жизнь тех автобусов, которые давно подлежат списанию, так как приобрести новые не по карману. Недавно своими силами в автопарке в течение 9 месяцев отремонтировали автобус ЛАЗ-699. В капитальном ремонте нуждается автобус ЛАЗ-695. Но из-за отсутствия средств автопарк не в состоянии отправить его на Гомельский авторемонтный завод.

Главным тормозом в работе глуских транспортников является отсутствие топлива. Долг автопредприятия перед Осиповичской нефтебазой составляет 10 миллионов рублей и погасить его в ближайшее время не представляется возможным. Приходится работать с колес: что привезли, сразу же расходуется.

В связи с отсутствием средств для приобретения запчастей водителям приходится ездить на машинах, готовых развалиться в любой момент. На сегодняшний день 50 шин для автобусов и 110 шин для грузовых автомашин требуют замены. В то же время одна автобусная шина обходится в 115 тысяч рублей, а шина для грузового автомобиля – 90 тысяч... Положение спасает пока только высокая квалификация работников автопарка, которые стараются поддерживать технику в рабочем состоянии. Но скоро не будет и этого.

Объемы перевозок значительно уменьшились по сравнению с предыдущими годами. Так, план перевозок пассажиров в этом году составляет почти 94% от прошлого года. В то же время существующие цены на проезд в автобусе не оправдывают затрат. В итоге за 4 месяца междугородние перевозки дали глускому автопредприятию 2 миллиона 914 тысяч рублей убытков. Нерентабельны все пригородные маршруты. Только за апрель этого года маршрут Глуск-Бобровичи дал почти 414 тысяч рублей убытков, маршрут Глуск-Ратмировичи – 482 тысячи. В связи с тем, что около полусотни категорий граждан имеют в настоящее время право на льготный проезд, в итоге его оплачивают только половина пассажиров, нанося тем самым автопарку существенный материальный ущерб, который не в силах смягчить даже государственные дотации. Выход в сложившемся положении директор Глуского АП № 15 В. Лазаренко видит в отмене всех льгот. А пока что получается абсурдная ситуация – чем лучше работают сотрудники автопарка, тем к большим убыткам это приводит.

Л. Канашевич
И. Кирин

Ударим чудо-кефиром по бездорожью и разгильдяйству!

Кефир в глуских магазинах – это такое же редкое явление, как приезд в Глуск председателя облисполкома. Так же, как и шоколадное масло. Или подшипники к велосипеду и предохранители к телевизору вместе с другими радиодеталями.

Не надеясь на торговлю, многие глущане получают кефир дома с помощью индийского грибка, который перерабатывает молоко в кисломолочный продукт. Как написано в инструкции, распространяемой вместе с грибком, он нормализует обмен веществ в организме, излечивает желудочно-кишечные заболевания, очищает организм от шлаков, повышает половую активность и даже прекращает рост раковых клеток. Врачи пока хранят молчание по поводу целебных свойств чудо-грибка. Но это не смущает глущан, которые делятся друг с другом выращенным грибком и с удовольствием пьют самодельный кефир.

Соб. инф.

ЯК НАС ВУЧЫЛІ

Яўхім Кіпель



Явхим Кипель (1898-1969) – известный белорусский политический и гражданский лидер, который жил после второй мировой войны за пределами Советского Союз и оставил свои архивы Белорусскому институту искусства и науки в Нью-Йорке.

Публикуемый фрагмент его воспоминаний охватывает период с 1906 по 1910 г.г. и описывает ранние школьные годы автора в его родной деревне Байлюки, около Глуска Бобруйского района. Кипель описывает, как были организованы школы, как ими руководили и как они стали орудиями русификации. Эти воспоминания отражают трудности, которые испытывали дети в восприятии и понимании объяснений на русском языке. Хотя некоторые учителя делали попытки ввести в употребление белорусский язык, запрет на который был введен в 1905 г. в начальных школах, им так и не удалось добиться успеха в борьбе с русским бюрократизмом.

Калі мне споўнілася сем гадоў, а майму старэйшаму брату было ўжо гадоў дзесяць, паўстала патрэба аддаць нас у школу. Школы ў нашай вёсцы Байлюкі, што на Бабруйшчыне, ня было. Найбліжэйшая школа была ад нас кілямэтраў чатырнаццаць у мястэчку Глусак, цяпер раённы цэнтр на паўдзённым захадзе

Магілеускае акругі. Гэта не такая вялікая далячыня: кажную нядзелю езьдзілі зь вёскі ў мястэчка — хто дровы на продаж вазіў, хто ў царкву езьдзіў — дык дастаўляць вучням харчы было ня цяжка. Але ўзьнікала пытаньне, як у расейскай школе змогуць нас вучыць, бо ў вёсцы й дарослыя мала ведалі расейскую мову, дзеці-ж амаль нічога не разумелі.

Памятаю такі выпадак: справа была ў позьнюю восень, бадай што ў Піліпаўку. Мужчыны малацілі ў гумне, воддаль ад іншых будынкаў, у хаце-ж былі толькі адны жанчыны ды дзеці. Гэтым часам у вёску прыехалі нейкія начальнікі, не валасныя, а здалёку.Яны зайшлі да нас у хату й пачалі пытацца: — «Как ваша фамилия? Ваше имущественное положение?»

У хаце былі тры жанчыны й ніводная зь іх не разумела, чаго ад іх хочуць. Паслалі мяне ў гумно па дзядзьку, якога ў нас уважалі за „знаўцу» расейскае мовы, бо тры гады адслужыў у арміі. Ён прышоў, выслухаў начальства й з аплёмбам сказаў: — «Вось дурныя бабы! Яны-ж пытаюцца, як вашае прозьвішча й якая ў вас маемасьць!» Жанчыны неяк вінавата схамянуліся ды нешта прагаварылі на сваё апраўданьне.

Падобныя выпадкі здараліся ў вёсцы часьцей і часьцей, і пытаньне з мовай стаяла вельмі войстра. Хлопцаў такога веку, як мы з братам, у вёсцы было яшчэ трынаццаць, і бацькі адчувалі, што дзяцей трэба неяк вучыць. Аднак-жа як вучыць, калі ніхто не разумее мовы? І таму на вясковай нарадзе нашыя ды іншыя бацькі пастанавілі, што хлапцоў трэба трошкі «абламаць» дома, а калі яны крыху будуць разумець расейскую мову, адвезьці іх у школу ў Глусак.

Тады якраз павярталіся дахаты салдаты, што былі на японскай вайне. Яны ў вадзін голас казалі, што няпісьменнаму чалавеку на вайсковай службе вельмі цяжка. І гэта яшчэ больш пераконвала, што дзяцей трэба вучыць. Нашая вёска дзеля гэтага наняла настаўніка. Быў гэта малады хлапец Алімп Шуляковускі з шляхоцкага засьценку Лучкі, што недалёка ад Глуску.

Навука пачалася з навучаньня рэлігіі. Усе мы былі праваслаўныя, таму нас вучылі паправаслаўнаму хрысьціцца й праваслаўныя малітвы. Разам мы пачалі вучыцца літараў ды чытаць цэлыя словы. Пры вучэньні словаў сустракаліся бадай непераадольныя цяжкасьці. Прыкладам, нам трапілася слова **ушат**. Настаўнік нам казаў, што **ушат,** гэта цэбар, і гэта трэба запомніць. Далей настаўнік казаў, што **лошадь,** гэта конь, **весы** — вага, **карман** — кішэня, **портной** — кравец, **сапожник** — шавец, **кузнец** — каваль і гэтак далей.

Для малых гэта было вельмі цяжка, бо незнаёмых словаў было шмат, а запамінаць нязьвязаныя словы для дзяцей нялёгкая справа. Калі хто з нас выяўляў вялікую цікавасьць ды дапытваўся чаму, прыкладам, цэбар стаўся

каб не саромеліся. Настаўніца яшчэ дадала, што „папячыцель» будзе не адзін, а зь інспэктарам Чарнэцкім. Пасьля гэтага яна выйшла з клясы, а хвілінаў празь пяць у клясу ўвайшоў апякун разам зь інспэктарам.

Вучні ўсе ўсталі — гэткі быў звычай — а старэйшы вучань Зьміцер Жышкевіч (гадоў пятнаццаць пазьней яго расстралялі палякі) прачытаў малітву. Апякун загадаў вучням сесьці й прайшоў па клясе. Быў ён не стары, з шырокім тварам і русаватай барадой. Апрануты ён быў у чорны даўгі сурдут, што на нас зрабіла ўражаньне вялікае ўрачыстасьці. Ён ветліва ўсьміхнуўся й дзіўна гутарыў. Для нас першае, што ўрэзалася ў вушы, гэта тое, што пасьля кажнага слова ён вымаўляў «ну-с» і „да-с», а гэткае гутаркі мы ў Глуску ніколі ня чулі. Зь ягоных першых пытаньняў я нічога не зразумеў. Паўстала нейкая нязручная напружанасьць і, каб яе абарваць, настаўніцы сказалі, што распачынаюцца заняткі.

Малодшая настаўніца павяла заняткі зь першым аддзелам, а апякун, інспэктар і старэйшая настаўніца пачалі гутаркі з другім годам навучаньня. Гадом трэйцяму й чацьвертаму далі самастойныя працы. Хоць вучні й пачалі пісаць свае працы, аднак незаўважна прыглядаліся, што рабіў апякун. Сядзеў ён за сталом, а настаўніца чытала вучням апавяданьне аб тым, як маленькая дзяўчынка Дар'я засталася круглаю сіратой. Ейны дзедка захацеў узяць сіротку да сябе, а бабка была супроць гэтага. Бабка казала: — „Калі мы возьмем Дар'ю да сябе, дык нам ня будзе за што й солі купіць, каб пахлёбку пасаліць». Дзедка-ж на гэта адказаў, што „они ее, похлебку, несоленую съедят».

Калі настаўніца прачытала апавяданьне, апякун пачаў задаваць вучням пытаньні. Першае было: — „Ці зразумелі апавяданьне?» Усе маўчалі. „Ну-с,» — сказаў апякун — „посмотрим!» Другое пытаньне вучні зразумелі больш-менш гэтак: Навошта дзедка й бабка хацелі ўзяць да сябе ўнучку Дар'ю? Бадай аднагалосна вучні адказалі:,— „Каб яе пахлёбку есьці несалёную».

Пачуўшы такі адказ, твар апякуна зрабіўся напружаным. Ён папрасіў усіх падумаць і адказаць яшчэ раз. Тое самае паўтарылася ізноў: — „Унучку Дар'юшку дзед і бабка бралі да сябе, каб яе пахлёбку есьці несалёную». Тут апякун падняўся з крэсла, і вымаўляючы словы паасобку, спытаўся, чаму вучні так думаюць, што дзед і бабка будуць. зьядаць унучкіну пахлёбку. Адзін з вучняў адказаў: — „Бо-ж так настаўніца сказала: «ее похлебку».

Вытварылася непрыемнае становішча, і настаўніца ўмяшалася ў размову. Яна растлумачыла, што пад словам „ее похлебку» трэба разумець „гэтую пахлёбку». Аднак дзеці гэтага ніяк не маглі зразумець, чаму трэба прыбаўляць слова «гэтую». Каб загладзіць інцыдэнт, апякун нешта сказаў і ўсьміхнуўся, што вучнямі было ўспрынята як жарт, і атмасфэра

сьпяваць колькі царкоўных песьняў.

Недалёка ад нашае вёскі, у сяле Клятном, была старэнькая царква, у якую два разы на год прыяжджаў сьвятар спавядаць сялян. У тую царкву й павёў нас настаўнік да споведзі. У часе абедні мы сьпявалі, і гэта зрабіла вялікае ўражаньне: — „Пабачце, вунь, што за зіму навучыліся! Аж у царкве могуць сьпяваць!» — гаварылі сяляне. Таму, што мы нешта навучыліся, за прыкладам нашай і суседнія вёскі хутка адчынілі школы граматы ды таксама на свой кошт.

На другую зіму нас вучыў ужо іншы настаўнік. Перш-наперш ён нам загадаў купіць у Глуску кніжку, якая называлася „Северо-Западный Край». З гэтай кніжкай прыйшлі яшчэ большыя клопаты — мы зусім не разумелі, бо зьместам кніжка была для другога году, цяжкая, а нашая веда расейскае мовы бадай ніякая. Разам з чытаньнем кніжкі, мы вучыліся табліцы множаньня, усе чатыры арытмэтычныя дзеяньні, і пад канец зімы сталі разьвязваць некаторыя задачкі па задачніку Яўтушэўскага.

На трэйці год нас павезьлі ў народнае чатырохгадовае „вучылішча» ў мястэчка Глусак. Будынак школы зьмяшчаўся на валасным двары, у самым цэнтры мястэчка. Загадчыцай была настаўніца Надзея Аляксандраўна Савіч, а памочніцай ейная сястра Кляўдыя. Школа ўтрымоўвалася на валасныя грошы, ці бо на кошт сялян, і таму дзеці сялян прыймаліся ў першую чаргу, а на вольныя толькі месцы прыймалі дзяцей мяшчан і шляхты. Пры школе быў інтэрнат, але ён быў невялікі й таму дзяцей мяшчан і шляхты ў інтэрнат ня прыймалі. Яны мусілі жыць на прыватных кватэрах. Дзяўчат у школе было ўсяго колькі й жылі яны таксама на прыватных кватэрах. Жыдоўскіх дзяцей у школу зусім ня прыамалі.

Рэлігіі дзеці былі праваслаўнае або каталіцкае. Праваслаўных было шмат больш. Агулам-жа ў школе было вучняў каля дзевядзесяцёх. Для дзьвюх настаўніцаў гэта была даволі вялікая нагрузка.Курс навучаньня ў школе быў чатырохгадовы. Лекцыі адбываліся ў вадным вялікім пакоі, і кажная настаўніца вяла два аддзелы.

Нас з Байлюкоў пасадзілі ў другі аддзел. Вучыцца тут было шмат цяжэй. Настаўніцы гаварылі з намі пераважна парасейску. Напачатку мы іх амаль не разумелі. Яны гэта бачылі й заўсёды тлумачылі нам панашаму, аднак настойліва ўсё-ж вымагалі, каб мы зь імі гаварылі, як яны казалі, «правільна». Нам тады не казалі, што гэтае слова пабеларуску, а тое парасейску. Нам казалі, што гэтае слова „няправільнае» й таму яго ня трэба ўжываць у гаворцы.

Практычна гэта давалася цяжка й азначала, што нам забаранялася карыстацца найбольш ужыванымі словамі — **хіба, як, трэба, бачыў,** чуў і

падобнымі, ці, інакш кажучы, забаранялася ўжываць засвоены дзяцьмі лексыкон, а заміж гэгага вымагалася завучваць новы — **разве, как, нужно, видел, слышал.**

У вучняў адразу зарадзілася апазыцыя да такіх словаў і зваротаў. Часам у клясе мы між сабой проста не гаварылі, а вельмі часта такія словы й звароты знарок перайначвалі, кпілі. Гэтак, заміж «нужно», мы нарочна казалі „нужнік». Калі настаўніца гэта пасьпела пачуць, дык ставіла вучня на калені, а часам страшыла, што накруціць вушы. Аднак, не зважаючы на пагрозы, мы адчувалі, што настаўніцы былі нам спагадлівыя ды часта ўдавалі, што ня чуюць, як мы міжсобку размаўляем.

Першы год нашае навукі ў Глускай народнай школе да нас даволі часта прыяжджаў з Бабруйску інспэктар народных школаў Чарнэцкі. Гэта быў мужчына сярэдняга веку, з чорнай барадой. Ён з намі часта й даволі доўга гутарыў, ніколі ня крычэў, калі мы не разумелі ягоных пытаньняў, стараўся нам вытлумачыць панашаму ды ўсё распытваў нас і пра школу і пра нашае жыцьцё ды пра тое, як мы гутарым у інтэрнаце.

Аднойчы інспэктар Чарнэцкі прыехаў да нас зь нейкім іншым начальнікам. У гэтага другога была таксама невялікая бародка. Апрануты ён быў у чорнае пальто з бліскучымі гузікамі й быў надта ветлівы да нас. У клясе ён пабыў гадзіны дзвве, паслухаў, як мы адкаэвалі на пытаньні, ды й паехаў. Перад ад'ездам ён падараваў нам цэлы мяшок цукерак. Калі ён ад'ехаў, настаўніца сказала, што гэта быў „прадвадзіцель дваранства» на Бабруйскі павет ды што ён найвышэйшы начальнік у павеце. Як прыпамінаю, ягоныя наведзіны школы былі ў позьнюю восень. Пасьля, аж да вялікоднага посту, да нас ніхто не прыяжджаў.

Але перад постам сталася нешта надзвычайнае. Аднае раніцы, калі мы ўсталі й пайшлі мыцца — уставалі мы дакладна а сёмай гадзіне — то знайшлі, што ўмывальнікі былі налітыя цёплай вадой і ўсё было прыбрана. Малодшая настаўніца была ўжо ў інтэрнаце й загадвала, каб мы памылі і рукі, і шыі, і галовы, а пасьля сьнеданьня, каб абавязкава папаласкалі рот. Загадала яна ўсім і пачысьціць боты. Мы ўсе мелі боты, хоць у кажнага з нас былі й лапці, аднак мы ў школе надзявалі іх рэдка. Гэтая падрыхтоўка да нечага зрабіла на нас івялікае ўражаньне, і мы зь цікаівасьцяй чакалі, што будзе далей.

А гадзіне 9-ай мы, як звычайна, прыйшлі ў клясу. Праз хвіліну-другую ў клясу ўвайшла старэйшая настаўніца ды сказала, што ў нашую школу прыехаў „папячыцель» — апякун — Віленскае навучальнае акругі. Настаўніца вытлумачыла, што гэта найвышэйшы начальнік над усімі школамі ў акрузе. Расказаўшы яшчэ ў колькіх словах пра Вільню, яна нас папярэдзіла, каб мы не хваляваліся, каб адказвалі на пытаньні як умеем, і

распружылася.

Далей апякун пачаў задаваць пытаньні пра пагоду, лес, поле, жніво ды іншае. Вучні падбадзёрыліся — яны больш разумелі, але адказваючы сваімі словамі ўстаўлялі знаёмыя сабе словы: **як, добра, далёка, хмарыцца** ды іншыя. Усім кінулася ў вочы, што апякун нешта ціхенька пытаўся ў настаўніцы ды запісваў у таўсты сшытак. Час-ад-часу ён перапытваў словы, як **кволы, кіякі,** але вучні на гэта асаблівае ўвагі не зварачалі.

На другой лекцыі мы пачалі пісаць дыктоўку на правіла пісаньня літары „яць». Спачатку кажны вучань пісаў сказ у свой сшытак, потым адзін з вучняў запісваў гэты сказ на дошцы, і тады яго цэлая кляса разьбірала. Сустракаліся сказы, якіх вучні зусім не разумелі, прыкладам: „Ржаной хлебушка, калачу дедушка». Калі апякун запытаўся вучня, што гэта значыць, дык ён ня міргнуўшы вокам адказаў: „б’ю хлеб, стукаю аб хлеб». На такі адказ апякун відаць не спадз’яваўся, ён захваляваўся й пачаў распытваць: — „Як-жа ты будзеш біць хлеб і навошта будзеш гэта рабіць?» Вучань-жа трымаўся далей свайго ды казаў: — «А так напісана, і я помню, як настаўніца казала, што забіць цьвік у сьцяну па правільнаму будзе „заколотить гвоздь».

Ізноў паўстала зьбянтэжанасьць, і настаўніца пасьпяшалася з новым сказам. Сказ быў такі: „Прислуга подавала обед господам». Вучань, які запісваў сказ на дошку, у слове „господам» зрабіў націск на першае „о». Апякун асьцярожна перапытаў вучня, а той бойка паўтарыў: „господам» ды вытлумачыў: — „Гэта значыць багом». Апякуна гэта вывяла з раўнавагі, ён пачаў шпарка хадзіць па клясе.

Далейшае пытаньне перакanала апякуна, што вучань не разумее й слова „прислуга». Апякун папрасіў настаўніцу, каб яна растлумачыла вучням сказ „папростаму». Настаўніца неяк дакорліва, але з пэўнасьцяй сказала: — «Ну, вы гэтага не разумееце! — Папростаму гэта будзе так: — Чалядка падавала абед паном». Гэты пераклад «папростаму» вельмі зьдзівіў апякуна й ён папрасіў яго паўтарыць, перапытаў пааасобку кажнае слова, запісаў сабе ў сшытак ды перашэптваўся з настаўніцай.

Назаўтра апякун прыйшоў крыху пазьней. На другой лекцыі мы вучыліся назовы жывёлаў, прыладаў, будоўляў. У клясу былі прынесеныя табліцы з малюнкамі жывёлінаў, іх было найбольш. Апякун пачаў сам пытацца, як завуць кажную жывёліну. Ён вельмі зьдзівіўся, калі мы растлумачылі яму, што панашаму „сабака» — назоў мужчынскага роду ды што мы ў вёсцы ня ўжываем слова „лошадь», а толькі „конь».

Апякун, каб увайсьці з намі у бліжэйшы кантакт і больш пазнаць кажнага вучня, сказаў, што будзе выклікаць нас па-чарзе, паказваючы пальцам, і як

ён выкліча, мы павіінны назваць сваё прозввішча. Першага выклікаў вучня, які сядзеў на першай лаўцы. Той устаў і назваў сваё прозьвішча — Сапега. — „Ты паляк?» — запытаўся апякун. — „Не, я не паляк», — адказаў вучань. — «А хто ты? — пытаўся ізноў апякун. — „А я з-пад Глуску», — адказаў вучань, і апякун на гэтым пэрсанальныя пытаньні скончыў.

Наступным пытаньнем Сапегу было: — „Як завуць гэтую жывёліну? — апякун паказаў на табліцу — малюнак зубра. — „Гэта бой зуброў», — адказаў Сапега. Крыху хвалюючыся, апякун пытаўся далей: — „Чаму ты называеш гэты малюнак „бой зуброў»? Гэта-ж проста зубар — адкуль ты узяў, што гэта „бой зуброў»? Сапега-ж, нічуць не зьбянтэжыўшыся, адказаў: — „А ў кніжцы напісана „бой зуброў». Мы летась вучыліся з кніжкі „Северо-Западный Край», дык там так і напісана: „Бой зуброў».

Апякун зірнуў на настаўніцу, а тая яму адказала: — „У маёй школе гэты падручнік ня ўжываўся, але ўжывалі яго ў вясковых школах граматы». Яна дастала з шафы „Северо-Западный Край», знайшла там апісаньне Белавескай пушчы і там быў малюнак — два зубры бадуцца, а пад малюнкам напісана: „Бой зуброў». Вучні вясковай школы зразумелі, што слова „бой» належыць да назову зубра й што гэтак будзе „правільна».

Апякун паглядзеў на малюнак, абвёў паглядам нас, запісаў нешта ў сшытак, усьміхнуўся й з дапамогай настаўніцы запытаўся ў вучняў: — „Як будзе павашаму, калі быкі адзін другога ілбамі бадуць?» Амаль усе хорам адказалі: — «У нас кажуць, што быкі бораюцца». — «Ну, а калі адзін бык адалеў другога, як у вас кажуць тады?» — „У нас тады кажуць — працягвалі мы — зборaў, або — перамог». — «Ну, вось дзеці, — спакойна працягваў апякун, — паправільнаму гэта будзе, і трэба казаць: той бык, каторы перамог, называецца „победитель»!

Пасьля гэтае лекцыі быў перапынак, і на перапынку мы міжсобку абмяркоўвалі новае слова „победитель» ды дзівіліся, што як гэта так, — навет і апякун не разумее па-нашаму.

На наступную лекцыю апякун прыйшоў разам зь інспэктарам і настаўніцай. Ён прынёс кніжку й даў яе аднаму з вучняў, каб той прачытаў вершык, а пасьля расказаў яго сваімі словамі. Усе вучні мусілі ўважліва слухаць чытаньне й пасьля памагаць пераказваць. Памятаю, што апякун даў кніжку хлопцу зь сяла Машнічы, што недалёка ад Байлюкоў. Прозьвішча хлапца было Хадаковіч. Хадаковіч быў кемкі й спрытны вучань, і ён пачаў чытаць:

Уж небо осенью дышало,

Уж реже солнышко сверкало,

Короче становился день,

Лесов таинственная сень

С печальным шумом обнажалась . . .

Спачатку Хадаковіч спатыкаўся ў чытаньні. Апякун папрасіў яго прачытаць яшчэ раз, і другі раз хлопец прачытаў шмат лепш, не запінаючыся. Тады апякун запытаўся ў вучняў, ці зразумелі яны. Усе дружна, і разам зь імі Хадаковіч, адказалі, што зразумелі.

Апякун сказаў Хадаковічу пераказаць вершык сваімі словамі. Хадаковіч пачырванеў, закашляўся й стаіць. Тады апякун і настаўніца пачалі яму памагаць наводнымі пытаньнямі: — „Ну, што-ж, у восень сонца мацней грэе ці слабей?» „Слабей». — „Ну а чаго ў восень на дрэвах і па цэлым лесе становіцца менш?» Хадакевіч крыху падумаў, пасьля-ж схамянуўся й бойка адказаў: „Вужоў становіцца менш». Недарэчнасьць адказу відаць моцна ўразіла, і ўсе трое — апякун, інспэктар і настаўніца — пераглянуліся. Апякун падыйшоў бліжэй да вучня і ўсхваляваным голасам запытаўся: — „Скажы, Хадаковіч, чаму табе ў галаву прышлі вужы?» Хадаковіч зьбянтэжыўся й таксама ўсхвалявана пачаў гаварыць: — „А як-жа, а як-жа? Вось-жа тут напісана: «уж», „уж»! I ў нас у „Добрых семенах» напісана — „уж и гадюка». — Пры гэтым ён спрытна дастаў з-пад лаўкі падручнік „Добрые семена» і ў другой частцы падручніка хуценька знайшоў малюнак з подпісам „Уж и гадюка».

На твары Хадаковіча зьявілася пераможная ўсьмешка. Аднак апякун ад гэтага дыялёгу адразу пахмурнеў й неяк сумна загадаў Хадаковічу сесьці ды адазваў настаўніцу на бок. Гутарыў апякун з настаўніцай хвілінаў дзесяць і нешта пісаў у свой сшытак. Пасьля яны падыйшлі да вучняў і апякун голасна спытаўся ў настаўніцы. — „А што вы праходзілі зь імі з граматыкі? Ці ведаюць яны часьціны мовы?»

Настаўніца адказала, што з граматыкі яна нам толькі патрапіла растлумачыць злучнікі й што граматыка нам пакульшто зусім незразумелая, але яна пляную перайсьці асновы граматыкі ў наступным годзе.

— Так-с, так-с! — прагаварыў апякун, нешта ізноў запісаў у свой сшытак, а потым сказаў настаўніцы, каб яна растлумачыла панашаму значаньне вершу й пастаралася, каб мы зразумелі кажнае слова.

Ад нас апякун пайшоў да вучняў першага году навучаньня. Зь імі ён прабыў няпоўную гадзіну. У гэтым аддзеле былі сямігадовыя дзеці — першы год зь вёскі ў места. Расейскае мовы яны зусім не разумелі, і настаўніца кажнае слова з расейскае мовы перакладала на беларускую, а пасьля тлумачыла яшчэ пабеларуску й цэлы сказ. Ня толькі апякуну, але й нам,

крыху старэйшым вучням, было відавочна, як цяжка гэтым малым давалася разуменьне чужое мовы ў школе. Бадай кажнага вечара й на перапынках малыя ў нас пыталіся, а што такое **топор, рожь, глаза, полотенце, кушать, сапоги** ды іншае. Далёка не заўсёды й мы маглі дапамагчы ў гэтым меншым.

Асабліва дрэнна было з вымаўленьнем. Ніхто ні з нас вучняў, ні дарослых, якія прыходзілі да нас, вымаўленьня расейскага ня ведаў. На лекцыях-жа, на працягу пяцьдзесяцёх хвілінаў, трыццаць пяць напэўна трацілася на тое, каб вучні нешта зразумелі й правільна вымаўлялі парасейску. Удадатак, дзевядзесят працэнтаў зьместу падручнікаў было пабудавана на расейскім матар'яле: апісаньні Расеі, звычаяў, расейскай літаратуры. Усё гэта выррабляла ў нас неахвоту да школы, і шмат хто школу кідаў.

Як толькі апякун выйшаў, нас адпусьцілі на доўгі перапынак. Пагода тады была добрая, і мы пабеглі на двор. Як звычайна, мы на двары дурэлі, бегалі. У гэты-ж дзень, дурэючы на двары, я, падкраўшыся да аднаго хлапца па прозьвішчы Каблаш, пачапіўся да яго з заду на шыю. Рабіў я гэта й раней, і тады Каблаш цягаў мяне па двары. Аднак у гэты дзень ён, відаць, быў ня ў гумары й добра грымнуў мяне на зямлю крыкнуўшы: — „Адчапіся ад мяне, атрута!» Вокны ў будынку былі прыадчыненыя, і гэта пачуў апякун. Ён зрабіў нам знак рукой, каб мы падыйшлі да акна. Каблаш моцна пачырванеў і спалохаўся, аднак мы падыйшлі — ён першы, а я за ім.

— „Што такое атрута?» — запытаўся апякун у Каблаша. Каблаш маўчаў. — „Ну, скажы ты, — зьвярнуўся апякун да мяне. — „Атрутай прусакоў труцяць», — адказаў я. — «А чаму прусакоў?» — спытаўся, падыйшоўшы да апякуна, інспэктар Чарнэцкі. — „А так нашая бабка казала», — адказаў я. Чарнэцкі-ж дапытваўся: — «А, ну, паўтары, як яна казала!» — «А яна казала, калі тата зь дзядзькамі ехаў у Глусак на рынак: Хлопцы, купеце атруты прусакоў патруціць «. Тады інспэктар спытаўся мяне, ці я ведаю, як будзе прусак і атрута непанашаму — і я гэтага ня ведаў. Апякун на гэта ўсьміхнуўся ды сказаў нам, каб мы ішлі гуляць.

На трэйці дзень апякун пазнаёміўся з чацьвертым годам навучаньня. У гэтым аддзеле былі хлопцы па гадоў адзінаццаць-дванаццаць, аднак і яны парасейску яшчэ разумелі вельмі слаба. Як толькі апякун пачаў распытваць вучняў гэтага году — уся школа прыслухоўвалася. Апякун пачаў правяраць кажнага вучня ці ведае ён верш паэты Нікіціна „Русь». Гэты верш быў важны, ужо ад другога году навучаньня мы зналі, што бяз веды гэтага вершу нікога не выпускалі з школы. Верш пачынаўся так:

Под большим шатром голубых небес

Вижу даль степей зеленеется . . .

Верш гэты даўгі. Адзін вучань казаў адну страфу, другі працягваў, і гэтак далей. Чарга дайшла да вучня Хвядоса Ляпкі. Той устаў, назваў сваё прозьвішча і пачаў дэклямаваць:

И во всех концах света белого

Про тебя идет слава горькая . . .

Апякун зразу стрымаў хлапца ды папрасіў паўтарыць. Хвядос, ані не зьбянтэжыўшыся, паўтарыў тое самае. Апякун проста ўськіпеў, спыніў вучня й запытаўся, што значыць слова „горькая». Хвядос на пытаньне нічога не адказаў і стаяў моўчкі. Тады апякун спытаўся другога вучня, Грыпінскага, ці той ведае слова „горькая», на што Грыпінскі адказаў, што гэта значыць „нясмашна, горка». У клясе наступіла цішыня.

Шмат хто з нас ведаў, што ў вершы стаяла слова «слава громкая», аднак усе сядзелі ціха, уткнуўшы твары ў лаўкі. Праўда, апякун хутка сябе апанаваў, прайшоўся раз-два ўзад і перад ды зьвярнуўся да цэлае клясы з пытаньнем, хто разумее правільна гэты верш. Адзін з вучняў з чацьвертае клясы адразу падняў вельмі высока руку й відаць было, што хацеў зьвярнуць на сябе ўвагу. Апякун паклікаў яго да дошкі.

На пытаньне, як ягонае прозьвішча, хлопец адказаў „Калесьнікаў» і без запытаньня пачаў тлумачыць, што ў вершы стаіць слова „громкая», а гэта значыць „славная, далекослышная». Апякуна гэта ўразіла й ён запытаўся хлопца адкуль ён. Калесьнікаў адказаў, што ён не мясцовы, ён рускі з Тульскае губэрні, ягоны бацька па прафэсіі канавал і вясной ходзіць па сёлах, а зімою іхная сям'я прадае абразы на рынку. Падчас гутаркі з Калесьнікавым апякун нешта запісваў у кніжку, пасьля ён выйшаў з пакою. Мы думалі, што ў школу ён больш ня вернецца. Аднак ён затрымаўся.

Па абедзе апякун захацеў паслухаць хор. Кіраўніком хору была старэйшая настаўніца, і мы прапяялі пару царкоўных і колькі расейскіх сьвецкіх песьняў. Аднак апякун захацеў паслухаць нашыя песьні, якія мы сьпявалі самі ў інтэрнаце. Пра гэта яму расказала настаўніца. Прасьпявалі мы песьні „Чаму-ж мне ня пець» ды „Служыў я ў пана ды першае лета, заслужыў я ў пана сьвіначку за гэта».

Тады апякун папрасіў нас засьпяваць нешта сумнае. А сумныя песьні мы сьпявалі найбольш. Хлапец Зелянкоў зь сяла Баянова пачаў запяваць „Зялёны дубочак на яр пахіліўся, малады ты, хлопча, чаго зажурыўся», а мы ўдала падхоплівалі. Калі мы скончылі песьню, апякун доўга сядзеў моўчкі, пасьля пахваліў нас і пашоў з клясы. Больш у школу ён не заходзіў, але мы яго яшчэ бачылі на валасным двары дзень ці два.

Нехта нам сказаў, што апякун хоча паехаць пад сяло Балашэвічы, у маёнтак да памешчыка Коршака. Мы ведалі, што дачка Коршака вучылася ў Вільні й часта, прыяжджаючы да хаты, дапамагала нашым настаўніцам у школе. І як цяпер, стаіць яна ў памяці. У нашых вачох яна была іншая, яна заўсёды гутарыла панашаму. Мы прыпушчалі, што апякун быў знаёмы зь ёю і хацеў Коршакаў адведаць.

Старшыня воласьці, Васіль Клімовіч, селянін зь сяла Рылавічы, узяўся адвезьці апякуна да Коршакаў, аднак не на валасным кані, а на сваім. Мы якраз гулялі на валасным двары, калі Васіль Клімовіч, старшыня, запрагаў каня, каб адвезьці апякуна й інспэктара Чарнэцкага да Коршакаў, ды казаў гэтак: — „Мой лошадь самы лепшы ў воласьці й як плюнуць давязе вас да маёнтку». Валасны сторож Амяльян дапамагаў старшыні, і хутка яны ўсе ад'ехалі.

Больш мы апякуна ніколі ня бачылі. Аднак тыдняў праз пару пасьля гэтага старшынёў хлопец пад сакрэтам нам казаў, што ён падслухаў, як гаварыў зь некім ягоны бацька, што нібы то нас дзяцей у школе пачнуць вучыць панашаму, як ён тады казаў — „пабеларуску». Мы, праўда, добра зразумелі, што значыць „панашаму», аднак мы зусім не ўяўлялі, што такое „пабеларуску», бо назоў „Беларусь» нам быў тады няведамы.

У Бабруйшчыне, і там, дзе я рос, тады яшчэ быў папулярны назоў „Літва», а мы былі „ліцьвіны». Было й цімала тых, хто памятаў, што й край называўся „Літвой». Было яшчэ таксама шмат сьветкаў паўстаньня 1863-64 гадоў. Мой дзед па бацьку быў у паўстаньні, ды ў Машнічах, Слаўкавічах, Байлюкох, і іншых суседніх вёсках і сёлах яшчэ былі жывымі сьветкі ды ўдзельнікі паўстаньня. „Мы — „Літва», — каваў мне заўсёды мой дзед. Ды й іншыя дзяды нам, дзецям, заўсёды казалі, што тут заўсёды была Літва.

Дарэчы, у нашай мясцовасьці ў паўстаньні 1863-64 гадоў асабліва вызначыўся малады Быкоўскі, сын старога ў нас роду шляхты. Ён быў багаты, меў вялізарныя маёнткі — Веснава, Машнічы і Баянава. Казалі нам дзяды, што ён надта любіў Літву й моцна біўся з царскім войскам. Памяць пра Літву перахоўвалі ня толькі нашыя дзяды ды паны, як Быкоўскі, але й маладзейшыя людзі й гэтыя ўспаміны перадавалі нам.

Пасьля ад'езду апякуна, заняткі пайшлі паранейшаму. Праз год я скончыў народную школу ў Глуску й пайшоў вучыцца далей. З трох хлапцоў у сям'і, мяне аднаго бацька, на намаганьні старэйшага брата Мікіты, пастанавіў вучыць. Наведаць школу ў Глуску мне больш не давялося.

Далей прьшшлі бурныя гады — юнкерская школа ў Кіеве, фронт, спачатку ў Румуніі, пасьля Фінляндыя, Масква й Заходняя Дывізія чырвонае арміі, горад Смаленск і ўрэшце Менск.

Я, і шмат іншых чырвонаармейцаў, пасьля заняцьця Менску Чырвонай арміяй у ліпені 1920 году, уключыліся ў грамадзкую працу ды пайшлі вучыцца. Пазьней тыя, што мелі асьвету, былі накіраваныя ў вайсковую камісію пры Інбелкульце для распрацаваньня вайсковае беларускае тэрміналёгіі. Кажны дзень мы мусілі ісьці ў Камісію, частка ішла на курсы беларускае мовы й беларусаведы, а таксама на лекцыі вайсковыя. Усе мы былі ў вайсковых формах, і было відавочна, што на нас пачыналася тварэньне Беларускае Тэрытарыяльнае Арміі. Гэта, аднак, іншая тэма. Успамінаю гэта я ў сувязі вось зь якім здарэньнем.

Аднойчы я ішоў на свае заняткі й амаль „лоб у лоб» сустрэўся з маёй настаўніцай з Глускае школы. Яна моцна пастарэла і, пэўна-ж, мяне не пазнала. Я прывітаўся, але яна спалохана адхінулася. Тады я сказаў, што я Яўхім Кіпель з Байлюкоў. Яна тады вельмі ўсьцешылася ды пачала казаць, як я зьмяніўся й як форма мяняе чалавека. Адразу запыталася, ці я вучыўся далей ды што раблю цяпер. Даведаўшыся, што цяпер я на вайсковай службе ў Менску, яна запрасіла мяне ў госьці. На той дзень я адмовіўся, аднак у першую-ж суботу да яе паехаў.

Жыцьцё ў Менску тады было нялёгкае, нехавала харчоў. Камандзерскаму складу паёк звычайна давалі на цэлы месяц, і ў тую сыботу якраз быў дзень выдачы пайка. Я ўзяў з сабой пайковы цукар — прыблізна тры кілі — колькі фунтаў селядцоў, пару кіляў хлеба, крыху гарбаты ды пайшоў да свае настаўніцы ў госьці.

Гэта была вельмі цёплая сустрэча. Яна вельмі ўсьцешылася з цукру ды гарбаты, узяла колькі селядцоў, хлеб у яе быў. Колькі гадзін яна мне расказвала, што здарылася за гэтыя гады каля Глуску на Бабруйшчыне, дзе знаходзіліся мае аднаклясьнікі. Тады я даведаўся, што шмат маіх сяброў было растрэляна палякамі. Успаміналі наагул шмат пра ваколіцы й людзей майго маленства.

У часе нашых гутарак мне прыпомніліся наведзіны нашае школы ў Глуску апякуном Віленскае акругі й я яе запытаўся, чаму тады да нас ён прыяжджаў. І вось што настаўніца мне расказала:

— Апякун прыехаў да нас у школу часткова зь ініцыятывы маёй і інспэктара Чарнэцкага. Мы з Чарнэцкім хацелі паспрабаваць перайсьці ў навучаньні дзяцей на беларускую мову. Аднак Інспэктар сказаў, што рабіць гэта трэба афіцыйна. Вы сабе й не ўяўляеце, як нам было цяжка вас вучыць. Папрыходзілі вы ўсе з глухіх вёсак і вы ня толькі не разумелі мовы, але наагул ня ведалі, як жыве горад. Інспэктар Чарнэцкі гэта добра разумеў і бачыў. І ён паведаміў аб гэтым павятовага „прадвадзіцеля» дваранства. У сваім дакладзе Чарнэцкі казаў, што гэтак дзяцей вучыць ня можна — яны

нічога не разумеюць. Прадстаўнік дваранства, пабыўшы ў нас у школе, таксама пераканаўся аб гэтым і падтрымаў нашае дамаганьне перад губэрнатарам і перад школьным апякуном у Вільні. На просьбу губэрнатара апякун школьнае акругі й паехаў у нашую школу. І там, у нас у Глуску, апякун прышшоў да высновы, што першыя тры гады дзяцей трэба вучыць, як тады ён казаў, «на беларускім дыялекце». З наведзінаў нашае школы ён зрабіў грунтоўны рапарт ды паслаў у Пецярбург. У Пецярбургу нейкі час справу трымалі, разглядалі, але пасьля з такім паглядам не згадзіліся ды загадалі працягваць навучаньне на расейскай мове. Гэта быў моцны ўдар і для нас настаўніцаў, і для інспэктара й для апякуна. Мы гэтую адмову моцна перажывалі, аднак зрабіць нічога не маглі.

— Так, Надзея Аляксандраўна, нам было цяжка вучыцца, бо мы, бадай, нічога не разумелі, — пацьвердзіў я. Яна тады ўсьміхнулася й вяла далей гутарку:

— І гэта была справа ня толькі ў мове. Аснова вашае цяжкасьці зразуменьня ляжала у зьмесьце, тэматыцы паданага матар'ялу. Воеь я дам прыклад: я вас вучыла расейскія песьні, аднак вы гэтых песьняў у інтэрнаце ніколі не сьпявалі, вы сьпявалі свае песьні, бо яны былі вам бліжэйшыя й зьместам і духам. Таксама з нашай школьнай бібліятэкай — я была яе загадчыцай — праз год-два я мусіла складаць рапарт, якія кніжкі чытаюцца найбольш. На першым месцы была кніжка „Князь Сярэбраны» Аляксея Талстога, за ім ішлі Гогаль, Данілеўскі й далёка ззаду былі Пушкін ды іншыя. Для мяне тады стала ясным, што дзеці ў першую чаргу цікавяцца тым, што яны разумеюць, што ім блізка духова. У кнізе „Князь Сярэбраны» апісвалася Літва, да беларускага жыцьця падобныя й апісаньні ў Гогаля і Данілеўскага, і таму вы іх чыталі. І вось такога блізкога вам духовага матар'ялу ў школе было вельмі мала й таму й дзеля мовы, і дзеля зьместу школа ня была вам блізкой, дык вы яе й ня любілі, — закончыла мая настаўніца.

Гэта былі мае першыя й апошнія ў яе наведзіны. Хутка выйшаў дазвол маладому каманднаму складу выходзіць у запас. Я з гэтае магчымасьці скарыстаў, паступіў на ўнівэрсытэт, а там былі новыя клоіпаты, і ня было часу разгульваць. Праўда, раз ці два я сустракаў настаўніцу на вуліцы й заўсёды яна мне казала, што новага ў Глуску, а я абяцаў, што, як толькі стане свабадней з часам, я да яе ізноў зайду.

Аднак час ляцеў. Надыйшоў для мяне незабыўны 1930 год. Мяне арыштавалі, два разы судзілі, саслалі, і на Беларусь змог я вярнуцца толькі ў 1942 годзе. 26 чырвеня 1942 году я на таварным цягніку прыехаў у Менск. Страшэнна выглядаў тады Менск — усё спаленае, разбуранае, чорнае.

На станцыі, дзе я купіў газэту, пастанавіў перш пайсьці ў рэдакцыю гэтае газэты. Пасьля пайшоў на Камароўку, у наш раён. Падарозе ўздумаў прайсьці праз Шпітальны завулак, дзе жыла мая настаўніца. Мне было цяжка знайсьці навет і сьляды перавулку — усё было спалена, і толькі невялікая сьцежка была рашчышчаная для хады. Прайшоў я да сярэдзіны завулку й недалёка ад сьцежкі ўбачыў невялічкі крыжык. Падышшоў бліжэй і на дошчачцы прачытаў:

НАДЗЕЯ АЛЯКСАНДРАЎНА САВІЧ

Задушылася ад дыму, чырвень I94I г.

Як нажом мяне разанула па сэрцы. Хоць і ня надта я быў сантымэнтальны, аднак камок падыйшоў да горла. Вось я стаяў яшчэ перад аднэй трагэдыяй нашага народу. Мая настаўніца ўсё жыцьцё працавала для народу, а пахаваная тут на вуліцы, і калі вуліцу рашчысьцяць, ейная магілка будзе зьнішчаная.

А зрабіла гэтая настаўніца нямала. Толькі з Глускае школы выпусьціла яна колькі сотняў хлапцоў, сярод якіх колькі дзесяткоў уключылася ў рух беларускага адраджэньня. Не зважаючы на суворую русыфікацыю, яна ўсё-ж патрапляла ня нішчыць дзіцяці духова, а наадварот — падтрымоўваць і разьвіваць у ім любоў да свайго краю. Яшчэ тады, у тыя далёкія часы, яна дамагалася ўвядзеньня беларускае мовы ў школу, яна аналізавала, што навокала адбывалася. У беларускі нацыянальны рух мае землякі ўключыліся, дзякуючы ейнай любасьці да свайго краю, дзякуючы ейнаму падыходу да вучняў, ейнаму такту й глыбокай народнай мудрасьці. Думаю, што такіх настаўнікаў у нас былі тысячы. У Беларусі ім некалі будзе пастаўлены помнік.

Информационный бюллетень Глуского районного клуба избирателей.
Выпуск 9(11). Июнь 2000 г.
Адрес для писем: 213860, г.п. Глуск, ул.Кирова, 43, кв.18.
Тел. 21-5-22(дом.). E-mail:glu-cl@mail.ru.
Тираж - 299 экз.
Редактор - Игорь Кирин.